Перадача «Беларуская этнафонія» [2] будуецца не па прынцыпе канцэрта, калі ў пачатку абвяшчаюцца назвы твораў, якія прагучаць, а па схеме «перадача-лекцыя», «перадача-ўрок»: абавязковай з'яўляецца тэарэтычная база і дэманстрацыя музычных узораў. Праз каментарыі спецыялістаў слухачы даведваюцца, у прыватнасці, пра традыцыі і абрады продкаў, сакральнасць і прызначэнне некаторых элементаў народнай культуры, пра змест і ўнікальнасць спеўнай традыцыі розных рэгіёнаў Беларусі. У такой падачы фальклор робіцца больш зразумелым для шырокага кола слухачоў, падаецца як неаб'емная і важная частка беларускай нацыянальнай культуры, што вылучае нас сярод іншых народаў. Акрэсліваецца яшчэ адна функцыя перадачы – адукацыйная, накіраваная на далучэнне да фальклору дзяцей і моладзі, якія з-за працэсаў урбанізацыі і глабалізацыі пазбаўленыя каранёвых асноў і ведаў.

Вартасць перадачы «Беларуская этнафонія» ацанілі супрацоўнікі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, якія выкупілі ў Белтэлерадыёкампаніі аўдыявыпускі для захоўвання іх у калекцыі «Фонапомнікі» з мэтай іх выкарыстання ў музейна-асветніцкай дзейнасці. У афіцыйным дакуменце-запыце пазначалася, што «аўдыязапісы перадачы адлюстроўваюць гістарычную рэтраспектыву і сучасны стан народнай музычнай культуры, канцэнтруюць звесткі, раскіданыя па розных крыніцах, а таксама ўтрымліваюць новую інфармацыю арыгінальнага характару». У фонды Нацыянальнага гістарычнага музея паступілі аўдыявыпускі з запісам этнафоніі Сенненскага, Гарадоцкага, Міёрскага раёнаў Віцебскай вобласці, этнафоніі Гомельскага раёна Гомельскай вобласці, народных спевакоў Л.Грынчык, В.Петакова, музыканта і майстра па вырабе народных інструментаў А.Ляся, фальклорнага ансамбля «Дубравіца», а таксама ўзораў мелодый веснавога і летняга календара, нацыянальных танцаў, беларускай дуды і інш.

Перадача «Беларуская этнафонія» выходзіць у эфіры канала «Культура» па нядзелях у 10:05. Выпускі паўтараюцца па суботах у гэты ж час.

Ахоп тэрыторыі вяшчання канала «Культура» складае крыху больш за 98 працэнтаў. Сігнал перадаецца таксама на памежныя раёны, што робіць культуру нашай краіны даступнай для пазнання ўкраінцамі, палякамі, літоўцамі, латвійцамі і расіянамі. Дзякуючы інтэрнэт-вяшчанню, музычны фальклор Беларусі можна пачуць у любым месцы, дзе ёсць глабальная сетка. Адсутнасць шырокай інфармацыі пра канал «Культура», паступовае ператварэнне радыё ў фонавы «сродак для настрою» ўплываюць на нізкі працэнт слухачоў, што негатыўна адбіваецца на данясенні да аўдыторыі лепшых узораў музычнага фальклору, г.зн. творы застаюцца непачутымі, нязведанымі і незразумелымі для сучаснага пакалення.

Трансфармаваныя творы, у аснову якіх пакладзены аўтэнтычныя ўзоры розных рэгіёнаў Беларусі, гучаць на канале «Культура» ў перадачах «У рытме дня» і «У кампаніі з «Культурай». Гэтыя праекты выходзяць у «прайм-тайм» і закліканы пасадзейнічаць далучэнню да канала новых слухачоў, якія выпадкова патрапяць на радыёхвалю і пажадаюць на ёй застацца. Дарэчы, прыхільнікам сусветнай фолк-музыкі канал «Культура» прапануе выбраныя выпускі вячэрняй перадачы «Канцэртная зала», створанай сумесна з Еўрапейскім вяшчальным саюзам.

Такім чынам, канал «Культура» Беларускага радыё, канцэпцыяй якога вызначана распаўсюджванне, перш за ўсё, найлепшых айчынных культурных здабыткаў, актыўна выкарыстоўвае музычны фальклор Беларусі ў аўтэнтычным і трансфармаваным выглядзе. Гэта садзейнічае папулярызацыі каранёвай музыкі, вяртанню да нацыянальнай спадчыны, напаўзабытай пад уплывам міжнацыянальнай глабалізаванай культуры. Галоўным праектам, арыентаваным на захаванне і перадачу фальклору, з'яўляецца праграма А.Макарэвіч «Беларуская этнафонія».

**Спіс літаратуры:**

1. Песнякевіч, Т. Крыніца з патэнцыялам ракі / Т.Песнякевіч // ЛіМ. – 2011. – № 44, 4 ліст. – С. 19.
2. Правапіс і фанетыка слова дадзены ў адпаведнасці з афіцыйна прынятым у беларускай навуковай літаратуры стандартам: Хай М.И. Этнофония, этнафонія, етнофонія / М.И. Хай // Восточнославянский фольклор : словарь науч. и нар. терминологии / редкол. : К.П. Кабашников (отв.ред.) и др. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 464.

***Святлана Кананові***

## ЗАХАВАННЕ І РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСАЎ: ПЕДАГАГІЧНЫ АСПЕКТ

Этнакультурныя працэсы адлюстроўваюць дынаміку ўсіх бакоў жыцця насельніцтва. Яны з'яўляюцца найважнейшым складнікам гуманітарнай бяспекі. І самым галоўным напрамкам развіцця грамадства заўжды было выхаванне новага пакалення. Традыцыйная сям'я адлюстроўвае ўстойлівыя рысы беларускага этнасу. Так, шмат гадоў у беларусаў існавала вялікая непадзельная сям'я, якая складалася з некалькіх шлюбных пар з дзецьмі, вяла калектыўную гаспадарку. Паступова колькасны склад сям'і беларуса памяншаўся. І найбольшай інтэнсіўнасці гэты працэс дасягнуў у Навейшы час. Што абумоўлена трансфармацыяй гаспадарчай функцыі сям'і і большымі патрабаваннямі да ўзроўню адукацыі дзяцей, іх усебаковай сацыялізацыяй, а ў апошнія гады і пагаршэннем эканамічных умоў жыцця значнай групы сем'яў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працэсе эвалюцыі сям’і беларусаў змяніліся ролі мужчыны і жанчыны ў сямейным жыцці. На змены ў сямейных адносінах моцна паўплывала значнае пашырэнне буйной вытворчасці, якая адпаведна выцясняла сямейную вытворчасць прадметаў і прадуктаў. Большасць функцый адышло да жанчын. Так, выхаваннем дзяцей у перыяд маленства, як і раней, зараз займаюцца пераважна жанчыны. У цэлым воблік беларускай сям’і значна змяніўся.

Сёння ў грамадстве назіраецца тэндэнцыя да зніжэння значнасці ролі сям’і ў жыцці чалавека. На жаль, змяняюцца формы сямейных і сямейна-шлюбных адносін. Назіраецца нізкі ўзровень культуры паводзін, несфармаваныя навыкі клопату пра ўласнае здароўе, адсутнасць станоўчага прыкладу бацькоў, манера паводзінаў і мыслення адпавядае нейкім універсальным, сярэднім стандартам, што ў сваю чаргу не спрыяе і выхаванню асобы дзіцяці, і фарміраванню нацыянальнай свядомасці. Усё гэта прыводзіць да страты традыцый народнай педагогікі, якая ўяўляе сабой цэлую сістэму народных ведаў і звычаяў [1].

Адным з асноўных прынцыпаў выхавання ў этнічнай культуры даследчыкі называюць <u>прынцып прыродазгоднасці</u>. Гэта асноўны прынцып беларускай народнай педагогікі, які заснаваны на тым, што ў выхаванні дзяцей абавязкова ўлічваліся іх ўзроставыя асаблівасці. Вылучаўся перыяд «маленства» (ад нараджэння да 6-8 гадоў). Ён падзяляўся, у сваю чаргу, на дзве ўзроставыя групы: «анёлкі» і «блазнюкі». Нованароджанага называлі «анёлкам». І гэта доўжылася да таго часу, пакуль яго не адбіралі ад грудзей – у 2-3 гады. Акрамя таго, у жыцці дзіцяці адзначаліся і іншыя перыяды яго росту, звязаныя з авалоданнем тымі ці іншымі ўменнямі: «Садзіцца»; «Поўзае»; «Стаіць на ножках»; «Робіць першыя крокі»; «Ходзіць»; «Кажа першыя словы».

Дзяцей выхоўвалі з улікам полу. У нашых продкаў нараджэнне хлопчыка было жаданым − ён будучы карміцель сям'і, падтрымка на старасці. Дзяўчынка ж − адрэзаная луста, выйдзе замуж і сыдзе з бацькоўскага дому. Акрамя таго, каб яе выдаць замуж, неабходна было рыхтаваць пасаг.

Аднак варта адзначыць, што жаданне мець сына ці дачку залежыць ад кожнай канкрэтнай сям'і. Дзе часцей нараджаліся дочкі, хацелі мець сына, а дзе сыны, там марылі пра дачку. Народ, вядома, разумеў, што добра нараджэнне дзіцяці любога полу. Дачка − памочніца ў хаце: «Без дачкі сям'я, што без агня».

Наступным прынцыпам, які лічыўся падмуркам у народнай педагогіцы, з’яўляецца <u>прынцып выхаваўчага асяродку [2]</u>.

У выхаванні маленькіх дзяцей прымалі ўдзел бабка-павітуха, маці і бацька, сёстры і браты, хросныя бацькі, бабулі і дзядулі, сваякі, а таксама суседзі. Бабка-павітуха выконвала галоўную ролю – яна дапамагала нарадзіцца дзіцяці. Над нованароджаным чытала спецыяльную малітву. Менавіта яна ў першы раз купала «немаўлятка». У ваду дадавала лекавыя травы, абавязкова кідала грошы – сімвал багацця і шчасця. Потым на шыю і ножкі дзіцяці завязвала чырвоныя паяскі, якія былі на ім, пакуль не выбіралі хросных бацькоў.

Асноўным выхавальнікам дзяцей прынята лічыць маці. «Ніхто дзецям так не спагадае, як маці радно». Маці была іх першым выхавальнікам, менавіта яна праводзіла з імі вялікую частку часу. Да 4-5 гадоў дзеці цалкам знаходзіліся пад апекай маці: яна іх карміла, надглядала, давала невялікія даручэнні. З 5 гадоў дзяўчынкі дапамагалі маці няньчыць малодшых братоў і сясцёр, а хлопчык з 7 гадоў станавіўся пастушком. Усё гэта дазваляе сцвярджаць, што ў выхаванні «Немаўляткі» важную ролю мелі старэйшыя сёстры, браты ж маглі яго пацешыць ў вольны ад працы час. Дапамагалі выхоўваць дзяцей бабулі і дзядулі. Яны маглі праспяваць ім калыханку, пацешыць, рабілі першыя цацкі.

Беларусы вялікае значэнне надавалі імені дзіцяці. Лічылася, што з імем звязаны лёс чалавека, яго шчасце, здароўе ці наадварот няшчасце, хваробы. У некаторых сем'ях імёны перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Часта імя дзіцяці давалі такое, якое адпавядала мясцовым традыцыям, нацыянальнае (Алесь, Янка і інш.). Прытрымліваліся і царкоўнага календара.

<u>Прынцып аздараўленчай накіраванасці</u> выхавання выконваў значную ролю жыцці беларусаў, не страціў ён сваёй актуальнасці і зараз.

У некаторых месцах Беларусі захаваўся звычай − пры нараджэнні дзіцяці пасадзіць дрэва [3]. Лічылася, што дрэва з'яўляецца крыніцай жыцця і росту, і нават ўплывае на лёс дзіцяці. Самым шанаваным дрэвам у славян быў дуб, які сімвалізаваў сілу, цвёрдасць духу. Паўсюдна ў Беларусі маці кармілі дзяцей грудным малаком да 1,5-2 гадоў, а некаторыя і больш - да 2-3 гадоў. Аслабленых дзяцей паілі казіным малаком, якое лічылася гаючым. Спала дзіця ў драўлянай калысцы («калыска», «зыбкая»), якую летам падчас жніва бралі з сабой у поле. Вешалі яе на дрэва або ставілі ў цянёк каля снапоў. Рабілі саламяныя і палатняныя калыскі, якія маці магла лёгка ўскінуць на плячо і несці ў поле [4]. Існавала павер'е, што дзеці будуць паважаць бацькоў, калі «калыску» зробіць бацька. Потым яна пераходзіла да наступных дзецей. Да года дзяцей спавівалі ў пялёнкі са старога ільнянога палатна, якія добра ўбіраюць вільгаць, не выклікалі раздражнення скуры. Каб ножкі былі роўнымі, зверху перавязвалі вузкім даматканай паяском («співачком»). Аднак некалькі разоў на дзень, калі мянялі пялёнкі, развязвалі і давалі дзіцяці парухацца. Спавівалі да таго часу, пакуль яно не ўставала на ножкі. Як толькі дзіця вучылася хадзіць, яго пускалі на земляны дол, траўку, пясок, якія былі на двары.

<u>Прынцып выхавання ў працы</u> ўплываў на фарміраванне асобы. Гэты прынцып знаходзіў сваё пацверджанне яшчэ да нараджэння дзіцяці. У беларусаў ідэальнай прынята было лічыць шматдзетную сям'ю, таму што дабрабыт залежыць ад таго, колькі ў ёй было працаўнікоў. Малады муж прасіў сваю жонку: “Радзі мне дзевять сыноў, // А дзясятай дачку ... // Сыны будуць поле баранаваць, // А дачка хустачкі ткаць”. Пры нараджэнні дзіцяці існаваў такі звычай: бабка-павітуха абразала пупавіну хлопчыка на сякеры, а дзяўчынкі на

РЭПОЗІТОРИЙ БГПУ

пралцы або ткацкім станку, каб яны выраслі працавітымі людзьмі. Да канца першага года жыцця дзяцей прывучалі самастойна мыцца, прычэсвацца, трымаць лыжку ў руцэ, карыстацца ёю.

Такім чынам, адным з найважнейшых крыніц сучаснай тэорыі і практыкі выхавання дзяцей ранняга ўзросту з'яўляецца беларуская народная педагогіка як сукупнасць педагагічных звестак пра досвед выхавання, якія захаваліся ў памяці народа. У беларускай народнай педагогіцы прадстаўлены і аксіялагічныя аспекты маральнага выхавання дзяцей. Беларуская народная мудрасць дапамагае настаўніку лепш зразумець змест маральнага выхавання, яго прынцыпы і метады, у аснове якіх ляжаць гуманістычныя ідэалы: вера ў магчымасць маральнага ўдасканалення чалавека, патрабаванне павагі да чалавека і стварэнне ўмоў, неабходных для развіцця асобы. Беларускі народ лічыць чалавечнасць галоўнай маральнай якасцю асобы, разглядае яе шырока, уключае ў паняцце чалавечнасці іншыя якасці, да прыкладу, паважлівыя адносіны да людзей. Для выпрацоўкі ў падрастаючага пакалення правільнай маральна-каштоўнаснай арыентацыі і выхавання гуманізму народ карыстаецца разнастайнымі сродкамі і метадамі [5]. Найбольш дзейснае і эфектыўнае – асуджэнне бесчалавечнасці: «Чалавечына! Адна душа ў боце, другая ў жывоце, а трэцця па свеце ходзіць да людзей зводзіць». Не менш яскрава праяўляюцца каштоўнасныя арыентацыі народнай педагогікі ў справе патрыятычнага выхавання. У яго аснове – выхаванне любові да Радзімы, да роднай зямлі і дому, да прыроды, да маці. Неад'емнай часткай і дзейсным сродкам патрыятычнага выхавання з'яўляюцца прыказкі і прымаўкі, легенды і паданні, казкі і песні. Народны вопыт патрыятычнага выхавання можа быць карысным настаўніку і ў педагагічнай прафесійнай арыентацыі. Такім чынам, беларуская народная педагогіка ўключае ў сябе сістэму каштоўнасных паняццяў, уяўленняў, поглядаў, і менавіта яна дапамагае ўзняцца да вяршынь агульначалавечых маральна-духоўных каштоўнасцей. Толькі праз этнапедагогіку можна пракласці шлях да агульнаграмадскай педагагічнай культуры [5].

Духоўныя каштоўнасці і ідэалы беларускага народа, лепшыя узоры нацыянальнай культуры – аснова адаптацыйных стратэгій сучаснай сям'і. Неабходна праводзіць мэтанакіраваную працу па ўмацаванні духоўных асноў грамадскага развіцця, што ў перспектыве дасць магчымасць для фарміравання новых мадэляў і стандартаў у сямейных і сямейна-шлюбных стасунках. У іх аснове будуць зацверджаны нормы не спажывецкіх адносін да чалавека, асяроддзя, соцыўму, а нормы высокіх маральных устояў, самаўзнаўлення і самаарганізацыі.

**Спіс літаратуры:**


1. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л.В. Ракава ; НАН Беларусі, ІМЭФ. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 309 с.
2. Беларусы / НАН Беларусі, ІМЭФ. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 10 : Славянскія этнакультурныя традыцыі / І.У. Чаквін, А.У. Гурко, Т.І. Кухаронак. – 2007. – 513 с.
3. Беларусы / НАН Беларусі, ІМЭФ. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 5 : Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 374 с.
4. Беларускі фальклор : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для філал. спец. вышэйш. навуч. установ / склад. : К.П. Кабашнікаў і інш. – Мінск : Вышэйш. шк., 1996. – 856 с.
5. Мид, М. Культура и мир детства : избр. произв. / М. Мид ; пер. с англ. и ком. Ю.А. Асеева; сост., авт. послесл., отв. ред. И.С. Кон ; АН СССР, Ин-т этнографии им. Н.Н. Миклухо-Маклая. – М. : Наука, 1988. – 429 с.


***Фёдар Рацык***

## ЖЫВЕ Ў МОТАЛІ ТАЦІРКА…

Кожны чалавек, які жыве ў гэтым свеце, пакідае свой след. Хтосьці пакідае след матэрыяльны, а нехта духоўны. Матэрыяльнае праз некаторы час можаператварыцца ў попел ці труху, альбо, калі яго дбайна не захоўваць, знікнуць. Духоўнае, нематэрыяльнае, што захоўваецца ў чалавечай памяці, павінна праз некаторы час праходзіць працэс паўтарэння і узнаўлення. Абрады, звычаі, парадкі доўгі час захоўваліся ў людской памяці і перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Гэта прымянялася на ўласным вопыце, узаемадзеянні з асяродкам пражывання, выхаванні калектыўнай асобы і пэўнай мадэлі паводзін, якая склалася ў гістарычным развіцці грамадства.

Самабытнасць культуры Моталя, што ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці (мал. 1), дазволіла захаваць абраднасць [1] і традыцыйнасць. Але гэтага нельга б было зрабіць без сапраўдных аматараў песні. Адна з цікавых фармаў перажадчы традыцый – супрацоўніцтва з жыхарамі невялікіх вёсак, падчас якога яны абуджаюцца, маладзеюць душой, дзеляцца скарбамі сваёй памяці.Пра развіццё і станаўленне асобы спявачкі Любові Іванаўны Каткавец (мал. 2) як носьбіта традыцыйнай культуры будзе ісці гаворка. У яе памяці захаваны ўвесь фальклорна-этнаграфічны рэпертуар. Гэта песні каляндарнага і сямейна-побытавага цыклаў, лірычныя, дзіцячыя, сірочыя песні, замовы і апісанні абрадаў і звычаяў, легенды, прыкметы, павер'і.

Фарміраванню голасу і манеры спеву, па меркаванні самой спявачкі, яна абавязана ў першую чаргу прыродзе і бацькам: «*У мэнэ воно мой прыроднэ гэтэ спыванне.І считаю, шо гэто даецца от прыроды. Оге бы*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ